III. Школьна-гурткавая работа. Работа прафарганізацый, якая становіцца больш складанай, слабая падрыхтоўка вылучаемых на сталую працу членаў фабзаўмясцкомаў, розных камісій, праўленьняў саюзаў, беспарыўны рост членаў саюзаў за лік новых пластоў рабочых, асабліва высоўваюць неабходнасьць павышэньня профэсыянальнай пісьменнасьці рабочых, работніц і служачых і ў першую чаргу профактыву.

Работа ў мінулым неабходных вынікаў не дала, існуючыя гурткі мелі шэраг недахопаў:

а) многалікасьць і разнастайнасьць програм як цэнтральных, так і асабліва выпрацоўваемых мясцовымі арганізацыямі;

б) рэкомэндацыйная літаратура надта абшырная і даволі часта ні маецца на кніжным рынку;

в) у большай (колькаснай) „на паперы“ сетцы профгурткоў—слабае па мізэрнасьці наведваньне іх;

г) непасрэдны якасны склад удзельнікаў гуртка (шэраговы рабочы, старш. фабкому і сталы працаўнік праўленьня, стары член саюзу з 1917-18 г. г. і толькі што ўступіўшы);

д) мала праяўленьня самадзейных форм працы профгурткоў, усё трымаецца на кіраўніку.

Маючы гэта на ўвазе, устанавіць наступную сыстэму і формы углыбленай профэсыян. асьветы:

а) элемэнтарны профгурток 1-ай ступені, працуючы з кіраўніком, мае на мэце зьліквідаваньне элемэнтарнай профняпісьменнасьці, арганізуецца пры прадпрыемствах, мясцкомах, окраддзяленьнях з распыленымі групамі аб'ядноўваемых членаў, пры клюбах і чырвоных кутках.

Устаноўка гуртка на групу шэраговых аднолькавага ўзроўню разьвіцьця (група старых рабочых—членаў саюзу, група „навічкоў“ і культурна менш разьвітых, група моладзі, жанчын і г. д.)

Запіс і наведваньне заняткаў выключна дабраахвотнае. Сетка гэткіх гурткоў апрадзяляецца зацікаўленасьцю і попытамі з боку профсаюзнай масы і наліччам вопытных і падрыхтаваных кіраўнікоў. Гурткі працуюць па скарочанай програме ЦСПС, рэкомэндаванай ЦСПСБ;

б) Школы профграматы паніжанага тыпу арганізуюцца па саюзнай і міжсаюзнай лініі, маючы ўстаноўку на нізавы профактыў (ФЗМК, Акраддзяленьні) і прадпалагае павышэньне ўзроўню профпісьменнасьці саюзнага актыву. Мэтод заняткаў—гутарка на аснове актыўнасьці ўсёй аўдыторыі з падразьдзяленьнем на групы (20—30 асоб) з кіраўніком.

Праца павінна весьціся па поўнай програме і падручнікам, рэкомэндованым і адобраным КА УЦСПС і КА ЦСПСБ, з сталым кадрам зай-

маючыхся і з абавязковым наведваньнем;

в) рухомая школа арыентыруецца выключна на раёны, местачковы, сельскі профактыў.

Гэткія школы організуюцца і больш мэтазгодны па міжсаюзнай лініі, павінны мець сталага звоненага працаўніка і мець дадатковыя сродкі на разьезды.

г) Мэтавыя (цэлявыя) краткатэрміновыя курсы па асобным саюзам і ў дробных акругах па міжсаюзнай лініі для працаўнікоў РКК, вытворчай камісіі, культ-камісіі, сакратароў ФЗМК, старшынь рабачкомаў, батрачкомаў і г. д.

IV Профсамаадукацыя. Сыстэма профсамаадукацыі мае сваёй мэтай паглыбленую працу над сабой больш разьвітай часткі рабочых, работніц і профактыву ўсіх ступеняў цераз гурткі па самаадукацыі. Культаддзелы саюзаў, культкамісіі, праўленьні клюбаў, павінны ўзяць на сябе ініцыятыву і функцыі першапачатковай організацыйнай дапамогі (пры ўзьнікненьні гурткоў) і мэтодычнага кіраўніцтва ў далейшым процэсе іх работы, наглядая за тым, каб і ў астатнім яны працавалі на аснове максымальнай самадзейнасьці.

Мэтодычнае кіраўніцтва і консультацыйную дапамогу па самаадукацыі, ажыцьцяўляюць мэтодычна-консультацыйныя бюро пры КА ЦСПСБ (габінэт профпрацаўніка) і пры АСПС, у задачу каторых уваходзіць паставіць прасоўваньне ў нізавую і серадзінную сетку профорганізацый програм і падручнікаў, распрацоўваемых УЦСПС, рэкомэндуемых ЦСПСБ; налажваньне вуснай і пісьмеянай консультацыйнай дапамогі, снабжэньне і рэкомэндацыя цераз профсаюзныя бібліотэкі патрэбнай літаратуры. Распрацоўка форм і мэтодаў консультацыйнай працы.

Асноўны падручнік для профсамаадукацыі — бюлетэнь, выдаваемы УЦСПС. „В помощь профграмоте“, „Школа профдвижения на дому“ і хрэстоматыі па профэсыянальнаму руху.

Аб працы сярод новых пластоў рабочых. Значны рост рабочае клясы БССР за апошнія два гады, наліча сярод нанова ўвашоўшых у вытворчасьць рабочых значнай праслойкі выхадцаў з вёскі, быўшых саматужнікаў; культурна-політычная і тэхнічная адсталасьць большасьці новых рабочых высоўвае перад усёй КП(б)Б, як адну з найважнейшых чарговых задач — усямернае разгортваньне політычна-выхаваўчай працы сярод новых пластоў рабочых, галоўным чынам, у напрамку ўсваеньня (вывучэньня) імі задач рабочае клясы ў вытворчасьці, роля яе як клясы кіраўніка, і ўцягненьне іх у русло социялістычнага будаўніцтва.

У мэтах ажыцьцяўленьня ўказаных задач, ЦК КП(б)Б прапануе акруговым і раённым партыйным комітэтам.

1. Вучытваючы важнасьці растлумачэньня новым рабочым сутнасьці социялістычнага характару дзяржаўных прадпрыемстваў і значэньне социялістычнага будаўніцтва ў цэлым, лічыць неабходным большае забясьпячэньне партыйным уплывам і кіраўніцтвам, разьвіцьцё масавай працы ў прыватнасьці, узмацненьні культурна выхаваўчай працы сярод іх, вядучы ў напрамку растлумачэньня сутнасьці гэтых пытаньняў на аснове конкрэтных фактаў і прыкладаў данага прадпрыемства.

Зьвярнуць асаблівую ўвагу на разгортваньне масавай работы сярод новых пластоў рабочых і на большае іх уцягненьне ў сыстэму політычнае, профэсыянальнае і вытворчае асьветы (адкрытыя сходкі ячэек, політгурткі, школы, клюбы, вытворчыя гурткі і т. п.).

2. Адзначаючы што да гэтага часу вытворчымі ячэйкамі ўдзялялась недастатачная ўвага рабоце з новымі пластамі рабочых, як асобай задачай, лічыць неабходным, з мэтай паляпшэньня сувязі ячэйкі з новымі рабочымі, вучоту іх настрояў, вылучэньне і вывучэньне беспартыйнага актыву з іх, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на правільную пастаноўку індывідуальнай і групавой працы сярод новых рабо-

чых у цэхах, вылучаючы дзеля гэтага найбольш падрыхтаваных таварышоў.

3. У мэтах большага уцягненьня (далучэньня) новых слаёў рабочых у профэсыянальны рух і большага іх абслугоўваньня усімі відамі профэсыянальнай працы, фракцыям профорганізацый зьвярнуць увагу:

а) на большае уцягненьне новых рабочых у профсаюзы, лічачы, што процант ня ўцягнутых у саюзы на асобных прадпрыемствах зьяўляецца значным („Дзьвіна", 14 проц.);

б) на вядзеньне працы па растлумачэньню ролі і значэньня профсаюзаў у справе організацыі вытворчасьці і аховы інтарэсау рабочых; практыкуючы дзеля гэтага паміма агульных відау работы гутаркі, вечары пытаньняу і адказау, праводзячы гэтую работу на прыкладах найбольш блізкіх і зразумелых новым пластом рабочых;

в) на разгортваньне больш энэргічнай працы па зьліквідаваньні няпісьменнасьці сярод новых пластоу рабочых;

г) на удзяленьні большае увагі сыстэме вытворчае асьветы, момантам зразуменьня новымі пластамі рабочых, значэньня важнасьці іх працы ў залежнасьці ад яе, усяго вытворчага організму, колектыўнаклясавай заінтэрасованасьці ў надняцьці вытворчасьці працы і разгортваньня усяе савецкае гаспадаркі;

д) на разьвіцьцё масавай вытворчай пропаганды сярод уноу прышоўшых на прадпрыемствы рабочых і работніц (шляхам організацыі спэцыяльных гурткоу па павышэньню іх кваліфікацыі, прыцягваючы дзеля гэтага кваліфікаваных рабочых і спэцыялістых, шляхам організацыі вечароў пытаньняў і адказаў на тэмы аб вытворчасьці, экскурсіі на аднародныя заводы, а таксама практыкуя на больш буйных прадпрыемствах консультацыі па пытаньням аб вытворчасьці для новых пластоў рабочых.

4. Прымаючы пад увагу значную колькасьць сярод нанова паступіўшых у вытворчасьць работніц, асабліва ў асобных прадпрыемствах, лічыць неабходным дапасаваць усе віды масавай працы сярод работніц к задачы абслугоўваньня новых работніц.

5. Зьвярнуць увагу на растлумачэньне новым рабочым сутнасьці нацыянальнае політыкі, у прыватнасьці беларусізацыі і забесьпячэньне абслугоўваньня іх на зразумелай мове.

У практычнай працы партыйных і профсаюзных органаў удзяліць больш увагі працы па растлумачэньню аб зьнішчэньні момантау міжнацыянальных непаразуменьняу.

6. У мэтах зьнішчэньня маючыхся выпадкаў антогонізму паміж старымі і новымі рабочымі, лічыць мэтазгодным пры наборы новых рабочых пасылаць іх на работу разам са старымі, недапушчаючы існаваньня особных зьменау з новых рабочых, а таксама ўцягваць іх нараўне са старымі рабочымі ва ўсе віды правадзімай масавай выхавaучай працы. У практычнай працы са старымі рабочымі ўдзяляць больш увагі на растлумачэньне ім важнасьці задач, стаячых перад рабочай клясай па выхаваньню новых кадраў рабочых, прыцягваючы іх, у першую чаргу, беспартыйны актыў, да практычнага выкананьня гэтай задачы.

У ЦКК КП(б)Б.

Праверка вясковых ячэек. Сакратарыятам ЦКК на падставе матэрыялаў камісій па праверцы вясковых ячэек зацьверджаны вывады аб выніках праверкі. Прызнана, што праверка дапамагла далейшему паляпшэньню работы праверaных вясковых ячэек. Праверкай устаноўлена, што агульнае становішча праверaных ячэек зьяўляецца здаровым, масавых праяў хворых зьявішчау у ячэйках няма, за выключэньнем

разьвіцьця п'янства сярод паасобных партыйцаў.

Але ў працы ячэек праверка выявіла шэраг важных недахопаў. Асноўныя недахопы па вывадам ЦКК наступныя.

Ячэйкі мала праяўляюць сябе ў ролі кіраунікоў грамадзкага жыцьця вёскі, не наладжваюць працы з беспартыйным актывам, а праца іх сярод беднаты абмяжоўваецца толькі правядзеньнем перавыбарных кампаній. Паказчыкам слабой сувязі ячэек з беспартыйным сялянствам зьяўляецца і слабы рост ячэек за лік сялян ад сахі і батракоў.

Слаба пастаулена ячэйкамі популярызацыя сярод беспартыйнага сялянства пытаньняў нацыянальнае політыкі, ня ўсюды праводзіцца праверка выкананьня дырэктыў у галіне беларусізацыі. Мала ўцягваюцца ячэйкамі ў грамадзкую працу вясковая інтэлігенцыя (настаўнікі, агрономы).

Значным недахопам у працы ячэек зьяўляецца таксама тое, што партікіраўніцтва ячэек працай саветаў і грамадзкіх організацый даволі часта зьяўляецца формальным, обмяжоўваючыся заслухованьнем іх дакладаў. Ячэйкі мала праяўляюць ініцыятывы і уплыву у справе паляпшэньня працы саветаў.

У галіне унутры-партыйнай і выхаваучай працы праверкай выяўлена: слабая політычная падрыхтованасьць значнай колькасьці партыйцаў і слабая ўвага з іх боку ў справе папаўненьня сваіх політычных ведаў; невыстарчаючасьць унутрывыхаваучай працы і кіраўніцтва ёю з боку бюро ячэек і РК, нерэгулярнасьць працы гурткоў, недахоп у іх літаратуры (падручнікаў).

Пляны працы ячэек даволі часта далекі ад рэчаваістасьці; адсутнасьць наладжанае сыстэмы праверкі выкананьня сваіх плянаў і дырэктываў парторганаў. Члены ячэек, асабліва радавыя таварышы, невыстарчаюча прымаюць удзел у грамадзкім жыцьці вёскі, што часткова можна вытлумачыць нероунамерным разьмеркаваньнем партабавязкаў і адсутнасьць даручэньняў і заданьняў партыйцам у іх партыйнай працы з боку бюро ячэек.

На працы ячэек па кіраўніцтву ЛКСМ дрэнна адбіваецца неактыўнасьць вылучаных прадстаўнікоў у ячэйкі комсамолу.

Сярод сялянак сыстэматычнае працы не вядзецца; дэлегаткі слаба уцягваюцца у савецкую і грамадзкую працу.

Дзеля зьнішчэньня азначаных недахапаў ЦКК зьвернута увага місцовых партыйных органаў і прапанована правесьці ў жыцьцё указаньні, дадзеныя праверачнымі камісіямі ячэйкам, робячы праверку ў будучым іх выкананьня.

У далейшым прызнана мэтазгодным перайсьці ад сыстэмы праверкі ячэек да сталага нагляду за становішчам работы ячэек і зьнішчэньня маючыхся ў іх недахопаў у процэсе штодзённага партыйнага кіраўніцтва.

АКК і Сэкцыі РСІ пры Гарсаветах. У зьвязку з адбываючыміся у сучасны момант перавыбарамі гарадзкіх саветаў, ЦКК у асобым пісьме к АКК зьвярнула іх асаблівую увагу на падрахаваньне вынікаў і вучоту вопыту працы сэкцый РСІ пры Гарсаветах, а Гомельскай і Рэчыцкай АКК —на організацыю гэткіх сэкцый. З гэтай мэтай прапанована прапрацаваць пытаньне на пасяджэньнях сэкцый РСІ і АКК і зьнішчыць маючыяся недахопы у працы сэкцый.

Маючы на увазе асабліва важные значэньне сэкцый РСІ для органаў КК—РСІ ўказана на неабходнасьць вылучэньня ў склад бюро сэкцыі прадстаўніка АКК—РСІ, які адказвау-бы перад АКК за пастаноўку і дзелавы ўдзел у працы сэкцыі.

У задачу АКК таксама пастаўлена уцягненьне ў сэкцыю групы актыўных членаў Гарсавету, праявіўшых інтарэс да працы контрольных органаў і поўнае выкарыстаньне іх на практычнай працы; уцягненьне дэлегатак і комсамольцаў, жадаючых працаваць у сэкцыі РСІ.

Побач з гэтым зьвернута ўвага АКК на ўзгадненьне пляну працы сэкцыі з агульным плянам правадзімае АКК працы па выпауненню важнейшых задач, знаходзячыхся у цэнтры ўвагі гаспадарчага жыцьця (зьніжэньне цэн, пытаньні рэжыму экономіі, барацьба з бюрократызмам і інш.), прыстасоўваючы да ўмоў мясцовае гарадзкой работы.

У зьвязку з тым, што у шэрагу мейц сэкцыі не выкарыстоўваюцца ў выстарчаючай меры, як адна з формаў сувязі з масамі, у пісьме падркэсьлена неабходнасьць пастаноўкі на сэкцыях РСІ дакладаў аб выніках найбольш буйных абсьледваньняў, праведзеных АКК—РСІ і прадстаўляючых інтарэс для Гарсавету

АКК у чарговым інформацыйным пісьме даручана паведамляць свой вопыт працы ў сэкцыях РСІ і гэта дасьць магчымасьць шырока высьветліць работу сэкцый і больш поўна выкарыстаць работу іх, як адну з формаў прыцягненьня працоўных да дзяржаўнай працы, у справе агульнай барацьбы за паляпшэньне дзяржаўнага апарату і барацьбы з бюрократызмам.

У МЕНСКІМ АК КП(б)Б.

Бюро Менскага Акругкому КП(б)Б разьбірала пытаньне аб узмацненьні раёнаў работнікамі кіруючага складу і адзначыла, што ў агульным раёны задаволены здавальняюча. Да слаба задаволеных галін належаць: судовая (36 проц.), дзяржстрах (35,7 проц.), фінансавая (27,2 проц.), зямельная (24,5 проц.) і паштова-тэлеграфная (28 проц.).

Адзначана вялікая цякучасьць кіруючага складу работнікаў у Койданаўскім, Астрашыцка-Гарадзецкім, Чэрвенскім, Пухавіцкім і Самахвалавіцкім раёнах, дзе адказныя работнікі зьмяніліся на 45-54 проц.

Асаблівая цякучасьць маецца у Парткомах і палітасьветорганах, так напр., Апоргі зьмяніліся на 109 проц., жанорганізатары на 81,8 проц., загад. нардамамі на 72,7 проц.

Бюро АК улічвае становішча на мясцох, ухваліла ўзмацніць партсіламі тыя галіны, у якіх мала партыйцаў; даручана Оргаддзелу Акругкому палепшыць якасны падбор пасылаемых тав., усебакова ўлічваючы прыгоднасьць кожнага пасылаемага работніка. Недапушчаць без асабліва важных прычын одзыву з раёнаў працаўнікоў, узяўшы курс на стабілізацыю работнікаў вёскі.

З прычыны недастачы ізбачоў і сакратароў сельсавецкіх, у той час, як маецца ізбытак работнікаў у горадзе, Бюро АК ухваліла адкамандыраваць рад таварышоў у раёны.

ХРОНІКА

I. Партыйна-організацыйныя пытаньні.

Вытворчыя нарады ў савецкіх гаспадарках. У Мазырскай акрузе ў сакавіку месяцы намечана правесьці вытворчыя нарады у савецкіх гаспадарках з наступнай дзённай:

1) Аб задачах і працы савецкіх гаспадарак.

2) аб вясеньняй і летняй пасяўных кампаніі.

3) аб працы вытворчых нарад у савецкіх гаспадарках (становішча, вынікі і перспэктывы).

4) аб нормах выпрацоўкі і вучоту вытворчасьці працы.

5) аб пераходзе на зьдзельшчыну і аплаце за пераработку норм выпрацоўкі.

Дакладчыкі па ўсім пытаньням выступаюць Акраддзяленьнямі саюзу працаўнікоў зямлі і лесу.

Абсьледваньне працы Савецк. ячэек. Мазырскім Акругкомам прыступлена да праверкі працы савецкіх ячэек. Для правядзеньня праверкі вылучаны 3 камісіі. Праверка павінна была быць закончанай 8 лютага.

Праверка выкананьня партдырэктыў. Праведзеная Калінінскім Акругкомам праверка выкананьня фракцыямі ўнепартыйных організацый партдырэктыў выявіла шэраг недахопаў: несвоечасовае праламленьне дырэктыў у працы з боку асобных працаўнікоў-комуністых, адсутнасьць у фракцыях сыстэмы праверкі выкананьня дырэктыў і непаладжанасьць праверкі з боку апарату Акругкому КП(б)Б. Дырэктывы Акругкому і пытаньні, патрабуючыя вырашэньня ў парторганах, у большасьці ўстаноў не прапрацоўваюцца на пасяджэньнях фракцый. Ёсьць выпадкі даручэньня выкананьня партдырэктыў беспартыйным супрацоўнікам і наогул адсутнічае сыстэма захоўваньня партдакумэнтаў. Адсутнічае з боку фракцый праца па палепшэньню апарату.

Акругком даў шэраг указаньняў па організацыйнаму афармленьню і ўпарадкаваньню працы фракцый.

Нарада сакратароў ячэек. На 21 лютага Барысаўскім Акругкомам склікаецца нарада Сакратароў вясковых ячэек з наступнай дзённай: 1) даклад 3-х ячэек, 2) аб працы сярод беднаты і 3) аб сыстэме кіраўніцтва ў сувязі з чарговымі задачамі партпрацы.

На 5-6 лютага склікаецца таксама нарада сакратароў савецкіх ячэек.

Праца з актывам ЛКСМ. Віцебскі Акругком канстатаваў дасягненьні ў справе умацаваньня актыву ў КСМ. Зьнішчаны прымаючыяся раней з боку комсамольцаў-актывістых моманты чаканьня перадачы у партыю і рост партыйнага ядра ў КСМ наогул праходзіць нормальна. Павялічылася таксама пролетарская частка актыву і процант беларусаў. У складзе раённага актыву павялічылася колькасьць дзяўчат на 4.7 проц.

З недахопаў адзначана: невыстарчаючая прыкладовасьць комсамольцаў - партыйцаў, зьмяншэньне дзяўчат (на 1,5 проц.) і батракоў (на 2.8 проц.) у складзе ячэйковага актыву, невыстарчаючая падрыхтоўка, наяўнасьць нездаровых настрояў у часткі актыву (нежаданьне працаваць, непаразуменьні паміж старым і новым актывам, недысцыплінаванасьць). З формаў працы з актывам апраче агульнай сыстэмы політасьветы і самаадукацыі практыкавалася і поўнасьцю апраўдала сябе правядзеньне спэцыяльных курсаў і нарад. Акругком даў указаньні аб правядзеньні таксама спэцыяльных сходак актыву КСМ з мэтай азнаямленьня яго з найважнейшымі пытаньнямі жыцьця саюзу і партыі.

Удзел КСМ у гаспадарчым будаўніцтве. Па дакладу Акругкоммолу аб удзеле КСМ у гаспадарчым будаўніцтве, Бабруйскі Акругком канстатаваў, што гаспадарчая праца паступова пачынае уваходзіць у штодзенную працу комсамольскіх ячэек. Маецца ўжо шэраг дасягненьняў: у горадзе скарачэньне прагулаў з боку комсамольцаў і рабочай моладзі, узмацненьне ўвагі, паляпшэньне якасьці продукцыі, узмацненьне удзелу моладзі ў вытворчасьці, нарадах і камісіях, рост кооперыраваньня рабочай моладзі (у некаторых прадпрыемствах кооперавана 100 проц. комсамольцаў), узмацненьне актыўнага ўдзелу ў працы ЦРК.

У вёсцы некаторы рост культурнасьці і прыкладовасьці (узорнасьці) гаспадарак комсамольцаў (пераход на шматпольле, закладка узорных вучасткаў, садовых гатомнікаў, паляпшэньне хлявоў і інш.), організаваны практычны ўдзел у праводзімых гаспадарчых кампаніях (лесанасаджэньне, сельска-гаспадарчыя выстаўкі), павышэньне ініцыятывы і удзелу комсамольцаў у розных гаспадарчых прадпрыемствах (пачынка мастоў, дарог, організацыя пажарных дружын, колектыўных закупак машын і т. п.)

З найбольш важных недахопаў Акругком адзначыў: слабы ўдзел у гаспадарчай працы савецкіх ячэек, слабая праца па аказаньню дапамогі беднаце, наяўнасьць момантаў

безгаспадарсьцьвенасьці комсамольскіх ячэек (неправільнае выкарыстаньне ленінскіх дзесяцін), хуліганства на вытворчасьці, нежаданьне працаваць у сваёй гаспадарцы. Акругком [illegible] аб зьнішчэньні недахопаў. У [illegible] адобрыў ініцыятыву КСМ у арганізацыі вытворчых спаборніцтваў і прапанаваў практыкаваць іх і ў нясцы. Як адну з формаў работы Акругком рэкамэндаваў правядзеньне нарад самастойных і культурных гаспадароў-комсамольцаў. Прызнана таксама неабходным практычна распрацаваць пытаньне аб падцягненьні комсамольцаў на [illegible] гаспадарчую і сапецкую працу.

Конкурс вясковых ячэек КСМ. Магілёўскі Акругком згадзіўся з прапановай АК КСМ аб правядзеньні конкурсу на лепшую комсамольскую сельячэйку [illegible] гаспадарчай і грамадзкай працы.

Конкурс ставіць задачы, высьвятліць і падагуліць дасягненьні у практычнай, гаспадарчай грамадзкай працы ячэек КСМ, ствараць грамадзкую думку сялянства навакол гэтых дасягненьняў і ўзьняць тым самым аўторытэту ячэек КСМ як памочніка партыі.

Конкурс будзе праводзіцца з 1 па 15 лютага.

Нормалізацыя партнагрузкі. 2-м Віцебскім Райкомам КП(б)Б праведзена праца па высьвятленьню партнагрузкі ў раёне. Праца праводзілася шляхам: вучоту колькасьці нагрузкі ў ячэйцы на кожнага члена, правядзеньне анкеты сярод групы актыву, прыблізнага вучоту колькасьці сходак і паседжаньняў у м-ц і удзел у іх партыйцаў і асабістых гутарак з сакратарамі ячэек і паасобнымі актывістамі. У выніку выявілася наступныя даныя: калі не лічыць партсходак і розных сходак і нарад, то з 1143 асоб не маюць нагрузкі 217 асоб, з адной нагрузкай 512, з 2 215, з 3 100, з 4 39, з 5 і вышэй 10 асоб. Агульная сярэдняя колькасьць гадзін, занятых грамадзкай, профэсыянальнай, партпрацай не больш 3-х. Ня гледзячы на гэтага мясцамі перагрузка, неувязка паміж рознымі паседжаньнямі і сходамі па часе, невялічасовага пачатку паседжаньняў і сходак, непадрыхтаванасьці пытаньняў на паседжаньнях і т. п., што выклікае дарэмную трату часу, а таксама не выстарчаючага выкарыстаньня і ўцягненьня ў працу беспартыйнага актыву.

Партядро і парткіраўніцтва ў КСМ. Барысаўскі Акругком констатаваў рост партядра ў КСМ з 6,96 проц. да 8,3 проц., паляпшэньне якаснага складу партыйнага ядра за лік павялічэньня ў партядры членаў партыі, павялічэньне прыёма ў партыю за лік рабочых, зьмяншэньне перадачы ў партыю комсамольцаў з „іншых", рост партядра у вясковых ячэйках за лік сялян ад сахі.

Адзначана таксама значнае паляпшэньне кіраўніцтва КСМ з боку РК, гарадзкіх ячэек і часткі вясковых ячэек КП(б)Б, здавальняючы ахоп партядра партасьветай і павышэньне яго палітычнага [illegible].

Побач з гэтым маюцца яшчэ значныя недахопы: слабы рост партядра за лік батракоў, дзяўчат, батрачак і сялянак, наяўнасьць у часткі партядра нездаровых настрояў (нежаданьне працы ў КСМ, парушэньне саюзнай дысцыпліны, камчванства) і неразуменьне пытаньняў унутрыпартыйнага становішча, слабасьць партядра ў актыве, асабліва ў бюро ячэек (з 588 членаў бюро толькі 68 партыйц.) адсутнасьць партядра ў значнай колькасьці вясковых ячэек, і ўсім яшчэ слабое партыкіраўніцтва з боку большасьці вясковых ячэек КП(б)Б.

Акругком намеціў шэраг мер па зьнішчэньню ўказаных недахопаў.

II. Пытаньні вясковай працы.

Ажыўленьне працы камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. У сувязку з тым, што перавыбары сялянск. камітэтаў узаемадапамогі адложаны на восень 1927 г., Калінінскі Акругком прызнаў неабходным правесьці пасьля перавыбараў сельсаветаў кампаніі па ажыўленьні работы камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. Кампанію намечана правесьці з 1 па 20 сакавіка.

Намечана правесьці абсьледваньне, рэвізію і інструктаваньне сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі, справаздачную кампанію сельскіх і раённых камітэтаў, шырокія пленумы РК з абмеркаваньнем справаздач, далейшых задач і пытаньня аб пасяўной кампаніі. Да гэтай кампаніі будзе прыстасавана таксама кампанія па кооперуваньню беднаты за кошт маючагася фонду ў 8.000 рублёў. На парадку дня пытаньне аб правядзеньні кампаніі будзе пастаўлена на абмеркаваньне Нарады сакратароў РК КП(б)Б.

III. Пытаньні Агітпроппрацы.

Праца рухомых школ. Магілёўскі Акругком падагуліў вынікі працы рухомых школ 1-ай ступені, 1-га набору. Адзначана, што дзякуючы рацыянальнаму выкарыстаньню сродкаў адпушчаных на ўтрыманьне школ, матэрыяльнае становішча слухачоў палепшылась, дзякуючы чаму ў параўнаньні з мінулым годам наведваньне школы слухачамі значна павялічылась (90 95 проц.).

Акругком лічыць, што школы насогул [illegible] бе апраўдалі. З недахопаў адзначана не[illegible] старчаючая ўвага РК КП(б)Б комплектаваньню школ і нездавальняючая жывая сувязь РК з школамі. Значна пашкодзіла працы позьняя прысылка падручнікаў, а таксама тое, што слухачы ня былі вызвалены ад працы на займаемых пасадах.

У мэтах замацаваньня атрыманых у школах ведаў, Акругком даў дырэктыву аб арганізацыі гурткоў па самаадукацыі па програме рухомых школ 2-ой ступені, для іх добра і здавальняюча скончыўшых.

Барысаўскі Акрутком прызнаў вынікі працы рухомых школ 1-га набору здавальняючымі. З недахопаў Акрутком адзначыў арэн... ны прац... комплектаваньне школ, невы... старчаючна ўважлівыя адносіны да гэтага Райкомаў і несвоечасовую прысылку падручнікаў. У мэтах палепшаньня комплектаваньня школ, Акрутком прызнаў неабходным ства... рэньне пры Райкомах адборачных камісій. Прызнана такжа мэтазгодным пры наяўнасьці на... лежных умоў заняткі школ праводзіць не у раённыя цэнтры, а у сельсаветы.

У сувязі з тым, што незадаволе... вынікі выкладаньня прыродазнаўства ў ... тах з прычыны адсутнасьці падручнікаў ... падрыхтаваных лектараў, прызнана мэтазгодным у школах 2-га набору выкладаньне прыродазнаўства не праводзіць, замяніўшы яго вывучэньнем беларускае мовы.

IV. Пытаньні працы сярод жанчын.

Праца дэлегацкіх сходак. Калінінскі Акрутком заслухаў даклад аб працы дэлегацкіх сходак скліканьня 1926 г.

Лік дэлегацкіх сходак супроць мінулага году ўзрос на 15, усяго працавала 66 дэлегацкіх сходак, з іх 62 пры вясковых ячэйках. Ахоплена сходкамі 2114 жанчыны, 1780 сялянак, з іх 61 проц. беднячак.

У першыню дэлегацкімі сходкамі ахоплена 82 саматужніцы. Усе дэлегацкія сходкі (за асобнымі выключэньнямі) працуюць нормальна, дэлегацкія сходкі забясьпечаны літаратурай. Апрача праграмных гутарак разбіркацца на сходках і практычныя пытаньні, чаго ў мінулым годзе ня было. Маецца 193 практыканткі, адзначана больш уважлівыя, чым ... ней адносіны да практыканток з боку устаноў і організацый. Поўні ідзе ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дэлегатак, асабліва сярод больш дарослых.

Акрутком адзначыў, што кіраўніцтва дэлегацкімі сходкамі з боку РК і большасьці ячэек прымае сыстэматычны характар і дау... [illegible] у [illegible] ... ш раённых нарад кіраў[illegible] ...лак аб правядзеньні РК абсьледваньня дэлегацкіх сходак, аб справаздачнасьці дэлегатак перад выбарнічымі і інш.

Вынікі комплектаваньня ВНУ БССР у 1926-27 навуч. годзе.

Комуністычны Унівэрсытэт Беларусі імя У. І. Леніна. У 1926-27 навуч. годзе ў Унівэрсытэт прынята 58 асоб, замест прадпалагаемых 85 (такім чынам, выканана 68,2 проц. заданьня). На асноўны курс прынята 11 асоб замест 35; на падрыхтоўчы—47, замест 50. (Апрача гэтага прыняты на II курс 1 т. і на III курс 1).

Унівэрсытэт укомплектаваны ня поўнасьцю. Да пытаньня комплектаваньня Комуніст. Унівэрсыт. Беларусі мясцовыя організацыі (акругі) аднесьліся ня з поўнай уважлівасьцю, так замест 127 асоб, павінных быць накіраванымі для адбору,—накіравана ўсяго 72, гэта значыць—заданьне выканана толькі на 56,7 проц. Як выканана заданьне па укомплектаваньню Ком. Унівэрсытэту Беларусі паасобнымі акругамі, пакажа наступная таблица:

Акругі	[illegible]	Накіравана	[illegible]	[illegible]	% у адносінах да разьвёрсткі
Менская	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Віцебская	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]		[illegible]
[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	8	[illegible]
Бабруйская	[illegible]		[illegible]	[illegible]	[illegible]
Аршанская	[illegible]		[illegible]		[illegible]
Полацкая	[illegible]		[illegible]	1	[illegible]
[illegible]	[illegible]				[illegible]
[illegible]	[illegible]		[illegible]	[illegible]	[illegible]
Мазырская	[illegible]		[illegible]		[illegible]
Інш. парт. орган	1[illegible]	[illegible]			
УСЯГО	127	72	56,7	58	68,2

Процант выкананьня разьвёрсткі паасобнымі організацыямі разнастайны: ад 100 проц.—Менская і

Бабруйская акругі да 14,2 проц. - Віцебская, 25 проц. - Полацкая. Трэба заувважыць і тое, што з боку тых акруг дзе, разьвёрстка аб камандзіраваньні для адбору была выканана поўнасьцю, там і падбор кандыдатаў, як правіла быў леп шы, так адносна прыёму заданьне Менскай акр. выканана на 114,2 проц., Бабруйскай—112 проц., Магілеускай—114 проц., у той час як Віцебская акр. толькі на 25 проц., Полацкай на 20 проц. і г. д. (Гл. 6 стаўбец табл.).

Процант рабочых у параўнаньні з мінулым годам зьменшыўся; проц. рабочых агульнага ліку студэнтаў Ком. Унівэрсытэту складаў 43,2 проц., у гэтым годзе проц. прынятых зьменшыўся да 39 проц.; на падрыхтоўчы курс у 1926-27 нав. годзе прынятыя рабочыя складаюць 47,5 проц., у мінулым рабочыя складалі 51 проц.. Павялічыўся процант сялян. У мінулым, сяляне складалі 51,4 проц. агульнага ліку студэнтаў, прычым гэтага году сяляне складаюць 55 проц.

Нацыянальны склад прынятых наступны: 68,5 проц.—беларусы, 21 проц.—яўрэі, 8,5 проц.—расійцы і інш.—3 проц. Па соцыяльнаму ста новішчу: рабочых—24 асобы—39% сялян—32—55 проц., іншых - 4- -6 процантаў.

У адносінах да партстажу склад прынятых палепшыўся; адсутнічае прыём кандыдатаў. Партыйцаў са стажам з 1918-20 г. г.—47,5 проц. усяго прыёму; 42 чал. (70 проц.) з прынятых—прымалі ўдзел у г[illegible] мадзянскай вайне. Па полу прынятыя падзяляюцца так: 53 мужч.—88 проц. і 7 жанчын—12 проц. Павялічыўся процант жанчын. (У мінулым годзе жанчын было у Унівэрсытэце 10 проц.).

Комплектаваньне ВНУ БССР. (ВНУ, Тэхнікумы, Рабфакі). З дакладу Галоўпрофасьветы на колегіі АПА высьветлена, што за ВНУ БССР захована значная колькасьць рабфакаўцаў з ліку скончыўшых у гэтым годзе (65 проц. выпуску суп роць 35 проц. мінулага). Значна па вялічыўся партыйны і комсамольскі склад: ВНУ—35,9 проц. супроць 31 проц. мінулага году, Рабфакі—74,5 проц. супроць 48,2 проц., Пэдтэхнікумы 39,1 проц. супроць 19,9 проц., Сельска-Гасп. Тэхнікумы 45,8 проц. супроць 28,5 проц., індустрыяльныя тэхнікумы—47,1 проц. супроць 30,2 проц.

Павялічыўся % сялян пры прыёме: ВНУ—49,9 проц. супроць 42,4 проц. мінулага году, Пэдтэхнікумы 54,2 проц. супроць 49,8 проц., сельск.-гаспад 70 проц. супроць 63,6 проц.

Павялічэньне % рабочых у раб[illegible] і адсутнасьць у прыёме ін[illegible]

1926-27 нав. г [illegible]

[illegible] 3 . . 36,3% 60,7% 1,9% 1

Колегіяй АПА адзначана: а) невыкананьне прынцыпу адбору паводле здавальняючых па акадэмічным ведам: з ліку асоб, трымаўшых залікі, прынята 1209 вытрымаўшых іспыты і апрача гэтага 569 асоб, здаўшых дрэнна залікі; б) паменьшэньне проц. рабочых у ВНУ і Пэдтэхнікумах: ВНУ — 14,6 проц. супроць 16,3 проц. мінулага году, Пэдтэхнікумы—9,9 проц. супроць 10,6 проц.

Дадзена дырэктыва у будучым годзе праводзіць больш строгі падбор не застанаўліваючыся перад невыкананьнем нормы прыёму. Апрача гэтага, з мэтай большага уцягненьня рабочых і сялян у ВНУ і Тэхнікумы аб неабходнасьці пашырэньня сеткі вячэрняе асьветы (вячэрні Рабфак, Тэхнікумы).

Комплектаваньне Совпартшкол Беларусі. У Віцебскую савпартшколу—у 1926-27 нав. годзе прынята 89 чал. Па соцыяльн. складу прынятыя падзяляюцца так: рабочых -48 чал. (54 проц.), сялян—36 (40 проц.), іншых 5 чал. (6 проц.), у мінулым 1925-26 нав. годзе рабочых было прынята 48 чал. (54 проц.),

сялян—33 (36 проц.), іншых—9 (10 проц.). Партыйцаў прынята ў гэтым годзе 46 чал. (51 проц.), а ў мінулым 32 чал. (35,5 проц.).

Магілеўскую — прынята ў 1926-27 нав. годзе усяго 133 чал. З гэтага ліку рабочых і батракоў 54 чал. (40,6 проц.), сялян—78 (58,6 проц.), іншых—1. Партыйцаў 88 і (66,2 проц.). У 1925-26 нав. годзе было прынята рабочых і батракоў — 76 (42,9 проц.), сялян—98 (55,3 проц.), іншых—3 (1,8 проц.), партыйцау 101 (57 проц.).

Па дакладу Галоўполітасьветы—аб выніках комплектаваньня Савпартшкол БССР- колегіяй АПА адзначана, што АК нявыкана дырэктыва ЦК адносна камандыраваньня ў Савпартшколы ўзростам вышэй 22 год і маючых больш партыйны стаж. У Віцебскую Савпартшколу з 89 чал., прынятых у гэтым годзе сяброў КП(б)Б - 32 чал. (36 проц.) і па узросту звыш 22 год 57 чал. (64 проц.); Магілеускую—прынята 133, з іх сяброў КП(б)Б 29 чал. (21 проц.), з узростам звыш 22 год 76 чал. (57 проц.).

З прычыны неналежнага падбору кандыдатаў з боку АК у Магілеўскую Савпартшколу замест 143 слухачоў прынята—133 (93 проц.); у Віцебскую - замест 123—89 чал. (72 проц.).

Дадзена дырэктыва ў далейшым прымаць у Савпартшколы толькі тых т. т., якая поўнасьцю будуць адказваць умовам прыему.

БІБЛІАГРАФІЯ

С. Я. Вольфсон. Диалектический материализм. Изд. VI исправл. и дополненное, ч. I-III. Госуд. Изд. Белоруссии. Минск. 1926. Стр. XIV+375.

В настоящей заметке я ограничусь рассмотрением нового, значительно дополненного, издания курса тов. С. Я. Вольфсона с одной лишь точки зрения—с точки зрения методологической: каковы принципы построения курса, круг проблем, излагаемых в нем, подход к рассматриваемым темам, архитектоника курса. При том разнобое во взглядах, который у нас существует по вопросу о предмете диалектического материализма, об об'екте его изучения, о задачах этой дисциплины—такая постановка вопроса имеет достаточное основание.

Хотя, в общем, курс является марксистски-выдержанным, и то, что изложено в нем, изложено более или менее правильно и добросовестно,—однако, изложено в нем не всегда то, что следовало-бы, и обойдено весьма многое, что необходимо было изложить, а изложенное—нужное и по существу верное—представлено не в той связи, не в том аспекте, в котором должно-бы быть освещено в правильно построенном курсе диалектического материализма. Оговорюсь, что хотя я и полагаю, что методологически курс неудовлетворителен, не отвечает поставленным пред ним задачам, это отнюдь не мешает мне считать книгу С. Я. Вольфсона одним из полезных пособий, имеющихся по данному предмету. По сравнению с другими аналогичными учебниками работа С. Я. Вольфсона заслуживает рекомендации, по сравнению-же с „должным" курсом, с курсом, каким он должен быть—она подлежит строгой критике и нуждается в радикальной переработке.

Автор курса правильно исходит из понимания диалектического материализма как философии. Не в пример нашим упростителям, отмечающим философию, выдающих за марксизм его социологическую часть, С. Я. Вольфсон руководствуется правильным пониманием диалектического материализма как цельного философского учения, частным случаем, приложением которого к сфере общественной жизни является исторический материализм. Тов. Вольфсон совершенно правильно понимает философию не как сверхнаучную дисциплину и не как энциклопедию наук, систему значит, а как „исследование форм мышления и изучение путей его развития", он сочувственно приводит определение философии А. Лабриола, согласно которому она рассматривается как методология частных наук, как „формальное знание акта и процесса познавания и мышления в любом отношении с опытом и наблюдением", как логика и диалектика. В этом вопросе мы целиком и полностью солидарны с тов. Вольфсоном (см. напр. мою ст. „Марксизм и философия" в журн. „Полымя", № 5 за 1926 г.) и горячо приветствовали-бы курс, написанный на основе последовательного проведения такого понимания диалектического материализма, если бы... дело не ограничивалось декларативным введением, если бы это понимание нашло практическое осуществление в построении курса. А этого то и нет. К введению нужно приложить другой курс, либо заменить введение иным, более соответствующим действительному содержанию курса.

Курс, вопреки введению, не есть марксистский курс методологии наук, не есть учение о познании „в любом отношении с опытом и наблюдением", не есть материалистическая логика и диалектика.

Элементы системы занимают непропорциональное место по сравнению с изложением марксистской методологии. Ряд кардинальных принципов диалектики вовсе не поставлен. Читатель не получает никаких сведений об отличных от марксизма методологических направлениях и критики их. Ни один беспристрастный читатель по прочтении книги не придет к выводу, что марксизм—методология. Изложение марксистской философии занимает в книге лишь 47 стр. (131—178), а социологии (не методологии социальных наук, а чистокровной социологии)—180 стр. (185—365). Глава о диалектике—20 стр., а о нравственности—32.

После двухсот страниц социологического текста читатель ничего не узнает о господствующей на Западе телеологической методологии обществознания, не будет подготовлен к критике, напр. органического направления, он не узнает о существовании вопроса о единстве методов естественных и общественных наук.

В главе о детерминизме нет ничего о раздирающей современную биологию борьбе телеологической и механистической методологии. Я не говорю уже о том, что и намека нет на указание о том, как с нашей точки зрения представляются напр. логические и математические понятия. Мы согласны, что социальную методологию следует гипертрофировать, но нельзя же в методологии „всех частных наук" аннулировать элементы методологии естествознания. Впрочем, вполне законно было для курса, читанного на факультете общественных наук, ограничиться при изложении методологии обществознания лишь общефилософского введения, но социологическая часть не построена как методология, а философское введение не освещает важнейших методологических принципов. Можно-ли излагать диалектику не освещая... категории противоречия, этой души метода, не упомянуть о столь методологически ценных категориях как общее, особенное и единичное, не рассмотреть отношения части к целому, индукции и дедукции? И совершенно не случайно историческая часть к курсу диалектического материализма ограничивается историей материализма, и не включает истории диалектики. И разве допустимо, предпослав небольшой философской части историю материалистической философии, лишить социологическую часть (две трети книги) введения о предшественниках *социологических* воззрений Маркса? Можно-ли говорить о Гассенди и не упомянуть о социалистах утопистах. И допустимо-ли строить курс марксистской методологии общественных наук, не удостоив даже упоминания драгоценного наследия методологии политической экономии.

Право, дельный комментарий к „Введению к критике политической экономии" и к ленинскому наброску о диалектике дали-бы изучающему марксистскую философию большее знание предмета. Разве можно на многих десятках страниц рассматривать различные виды идеологий и не изложить величественного учения Маркса о фетишизме. Без глубокого проникновения в экономические творения Маркса нельзя изучить методологию общественных наук. Богатейшая сокровищница марксизма осталась неиспользованной. Коренные вопросы методологии во всю их величину и в соответствующем аспекте даже и не поставлены. Вот почему у подготовленного читателя останется впечатление, что автор не излагает, не об'ясняет проблемы, а с большой легкостью скользит по их поверхности.

Я отметил уже непонятную однобокость исторической части (I). Она

имеет и другой огромный недочет. В ней нашлось шесть страниц для схоластической реакции средневековья, но нет и шести строк для классической идеалистической философии до Гегеля, нет места для критики неокантианского и махистского ревизионизма. А не зная, не умея преодолеть основные типы идеалистической философии, можно быть лишь догматиком-материалистом, пасуя при первом идеалистическом и ревизионистском наскоке на марксизм.

Большая часть книги занята *систематическим* марксистским изложением социологии, начиная с производительных сил и—вверх по плехановской пятичленке—до искусства. Если эта часть претендует на полноту—она недостаточна. Нет, напр., анализа семейно-брачных отношений, *науки*, национального вопроса. Если это иллюстрации (как уверяет тов. Вольфсон во введении) —они громоздки, многочисленны, однообразны. Гораздо ценнее было бы, напр., вместо многих „продольных" разрезов различных сторон общественной жизни, дать и один „поперечный" разрез конкретной эпохи во всем многообразии и взаимосвязи отношений, или привести один из анализов экономических категорий по Марксу.

Остро ощущается отсутствие главы о научном коммунизме и о методологии революционной *деятельности*, о диалектике борьбы.

Совершенно не учтены при написании главы о праве те достижения, которые сделала в последние годы марксистская мысль в разработке этого вопроса.

Все это дает мне основание утверждать,—amicus Plato, sed magis amica veritas,—что курс очень несовершенен, не разрешает вопроса об университетском учебнике диалектического материализма, хотя и написан ортодоксально и без всяких „уклонов"

Тов. Р. В. в „Правде" отпугивает от рассматриваемой книги все ми „жупелами" и „металлами" ревизионизма и эклектицизма. Предоставлю самому тов. Вольфсону удовольствие посмеяться над аргументацией рецензента. Я же, как ни старался, никакого отхода от ортодоксального марксизма в книге не обнаружил. Такими же близорукими как и я оказались и партийцы-теоретики А. Плотников и Вл. Сарабьянов („Книга и революция" № 3. за 1923 г., „Книгоноша № 5, за 1923 г.) и Б. И. Горев („Вестник социалистической академии" № 2) и рецензенты „Известий ЦИК" (№ 288 за 1924 г. и от 19-XII за 1926 г.). В книге т. Вольфсона достаточно действительных недостатков, незачем ей пристегивать мнимые. В ожидании, что ответ т. Вольфсона не замедлит выявить философский дальтонизм т. Р. В., отмечу лишь один штрих для характеристики его критического уровня.

В доказательство эклектичности книги т. Р. В. приводит цитату: „От зависти богов отца Геродота до влияния среды Тэна и т. д.", после чего победоносно потрясает восклицательными знаками и кавычками. Рекомендую читателю открыть на 71 стр. рус. перевода работу Антонио Лабриола „Исторический материализм"—подлинного автора этой цитаты, дословно списанной у него т. Вольфсоном. Вот уж поистине, т. Р. В., шел в одну дверь—попал в другую. „Эклектическая похлебка" оказалась „заваренной" другом Энгельса и одним из блестящих представителей первого поколения марксистов!

Б. Быховский.

Беларуская работніца і сялянка.

Орган Аддзелу па працы сярод жанчын ЦК КП(б)Б № 2 (28) 1927 г.

Разглядаемы намі лютаўскі (другі) нумар часопісі „Беларуская Работніца і Сялянка" прыстасованы галоўным чынам да Міжнароднага жаночага дню.

„Беларуская Работніца і Сялянка" разьлічана на чытача—працоўную

жанчыну. 8-ае сакавіка—дзень жанчын. Часопісь мусіла на сваіх старонках усебакова асьвятліць гэтае сьвята. А выйшла крышку іначай. Апрача перадавіцы „8 марта“, у якой таксама сьцісла закранаюцца пытаньні агульнага палітычнага становішча нашай краіны і апошніх падзей на Захадзе, апроч артыкулу Клары Цэткін „**Шаг к мировой революции**“—матар‘ялаў прысьвечаных міжнароднаму рабочаму дню жанчын - няма.

Нам здаецца яно крышку памылкова, трэба было-б непашкадаваць яшчэ адну-другую старонку для шырэйшага і глыбейшага азнаямленьня сваіх чытачоў з гісторыяй гэтага сьвята.

Зьмешчаны артыкул „**Все на перевыборы Горсовета**“ — заклікае жанчын прымаць актыўны ўдзел у гэтай працы; а выбраныя жанчыны павінны рупліва працаваць у саветах, гэтым самым укладываць долю сваёй працы ў Соцыялістычнае будаўніцтва, бо „работница должна стать крепкой опорой партии в советской работе“.

У журнале маюцца артыкулы „Разгул фашизма“ і „О Красной Армии“. І як звычайна лісты з месц і парады жанчынам па розным галінам гаспадаркі.

Апрача такога недахопу, як тое, што мала вельмі матар‘ялаў адносна сьвята жанчын, дзе пасутнасьці трэба было-б на старонках правесьці ўрачысты агляд праробленай жанчынамі працы, агульнае ўражаньне часопісь пакідае даволі добрае. Значна палепшыўся тэхнічны бок, што ў пэўнай меры прыцягвае да сябе большую ўвагу. Мала матар‘ялаў на беларускай мове.

Трэба вітаць такі крок рэдакцыі, які яна ўжыла перадрукоўваючы мастацкія творы: „поэма пра чорныя вочы“—Зарэцкага і другіх.

„Беларуская Работніца і Сялянка“ расьце, а наша авеянае дынамікай соцыялістычнага будаўніцтва жыцьцё — забясьпечвае далейшы рост.

А.

П л у г.

Месячна навукова-папулярная сельска-гаспадарчая часопісь.

Часопісь „Плуг“ налічвае трэці год свайго існаваньня. За гэты параўнаўча не малы час часопісь павінна была канчаткова знайсьці свой шлях, завербаваць сталы лік супрацоўнікаў-дапішчыкаў, аб‘яднаць іх вакол сябе. Часопісь за тры гады працы павінна была ўсебакова вывучыць сваіх чытачоў іх запатрабаваньні і падагуліўшы ўвесь здабыты матар‘ял, павінна была выпрацаваць, аформіць напрамак часопісі і спэцыяльна прыстасоўваць у папулярным выглядзе належны зьмест.

Ці справілася часопісь з сваёй задачай? Ці карыстаецца яна папулярнасьцю сярод сялянства і ці спраўляецца яна са службаю дапаможніка ў працы селяніна - земляроба?

Пастараемся зараз выявіць.

Рэч вядома, некалькі гадоў таму назад, маладая савецкая агрономія толькі пачала была разгортваць сваю працу і вось у гэтым пытаньні значную ролю адыграў „Плуг“. На яго старонках выяўляліся прыродныя і экономічныя асаблівасьці гаспадараньня Беларусі, у ранейшыя-ж часы гэтых матар‘ялаў, літаратуры па гэтаму пытаньню ня было. Вакол „Плуга“ гуртаваліся маладыя агрономы, абменьваліся вопытам сваёй працы і г. д.

„Плуг“—быў ініцыятарам стварэньня інстытуту сялян-дасьледчыкаў. „Плуг“ ня быў пасыўным у папулярызацыі і растлумачэньні сялянам тых мерапрыемстваў, якія праводзіць партыя і савецкая ўлада па перабудове і разьвіцьцю сельскай гаспадаркі.

З лістоў сялян, якія выдрукаваны ў „Плугу“, відаць, што часопіс адыграла спрыяючую ролю ў сэнсе дапамогі ў пастаноўцы гаспадаркі.

> „Гаспадарыць я пачаў ня ўмеючы. Вось тут „Плуг“ прышоў мне на дапамо[гу]. Я навучыўся правільна весьці гас[па]дарку. Цяпер я на вы таў ы атрымаў першую прэмію і ганаровы біле[т]

Так піша селянін Судак („Плуг“ № 1). Сувязь з сялянствам часо-

пісь, як відаць, разгартоўвае, але бязумоўна мала і на гэта адно з асноўных пытаньняў трэба зьвярнуць належную ўвагу.

Матар'ялы ў „Плузе“ даволі рознастайныя, ахопліваюць усе галіны сельскае гаспадаркі: ёсьць матар'ялы і па гаспадарцы палявой і па садоўніцтву, паляводзтву, па жывёлагадоулі, па земляўпарадкаваньню, лясной гаспадарцы, краязнаўству і г. д.

Адно толькі часамі сустракаюцца артыкулы, якія бываюць недаступны звычайнаму селяніну і іх трэба як можна папулярней даваць, проста,—а гэтым заваюецца цікаўнасьць да часопісі і аўтарытэт яе сярод сялянства.

Тыраж „Плуга“—як мы бачым у першым нумары за мінулы год—раўняўся ад 6—да 8 тысяч экзэмпляраў.

Гэта ня мала і ня многа, але трэба часопісь ажывіць цікавымі ілюстрацыямі з жыцьця і працы сялян, даваць здымкі паказальных палёў, станцый і г. д.

Гэтае мерапрыемства будзе спрыяць у далейшым больш шпаркаму распаусюджваньню.

Часопісь арыентуецца на селяніна-гаспадара, часопісь ведае яго запатрабаваньні і ў большасьці іх задавальняе. Але ўціхамірацца гэтым няможна, трэба для часопісі яшчэ многа каб палепшыць перадачу матар'ялаў, сувязь з чытачамі і бясспрэчна самы тэхнічны бок часопісі.

Два гады „Плуг“ рос і трэба надалей каб ён абагачваўся любоўю сялян і няспыняў далейшага, так яшчэ патрэбнага, росту.

Галь.

Адказны рэдактар: *Н. Галадзед*

Члены рэдколегіі: *А. Сянкевіч*, *Рыжоў*, *Гоўзман*, *А. Александровіч*



ЗЬМЕСТ

СЕМЫ ГОД ВЫДАННЯ | СЕМЫ ГОД ВЫДАННЯ

ПРЫМАЕЦЦА НА 1928 Г. ПАДПІСКА

НА ВЯЛІКУЮ БЕЛАРУСКУЮ ЧАСОПІСЬ ЛІТАРАТУРЫ, ПАЛІТЫКІ, ЭКАНОМІКІ, ГІСТОРЫІ

„ПОЛЫМЯ“

пад рэдакцыяй

З. Жылуновіча [illegible] М. Зарэцкага, і Я. Ліманоўскага

У часопісі прымаюць удзел [illegible] беларускія літаратурныя і навуковыя сілы.

Часопісь „ПОЛЫМЯ“ выходзіць раз у паўтара месяцы

(8 кніжак на год) РАЗЬМЕРАМ КОЖНЫ НУМАР 12-14 ДРУКАВАНЫХ АРКУШАЎ

З ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1928 ГОДУ НАМЕЧАНА ДА ДРУКУ:

ПРОЗА: Я. [illegible] і Бэкарт [illegible] Н. З. [illegible] (З [illegible]), Цішкі Гартнага — „[illegible]“), Тараса Гушчы — „У палескай [illegible]“, Я. Лімаоўскага — „Над абрывам“ [illegible] В. [illegible] і інш. [illegible]

ПАЭЗІЯ: Якуба Коласа — „На шляхох волі“, поэма, Т. Кляшторнага — „Сусьветы“, поэма, А. А[illegible] „[illegible]“ поэма, А. Дудара „[illegible]“, поэма. ВЕРШЫ Янкі Купалы і [illegible] В. М[illegible] М. Грамыкі і інш.

[illegible] „ПОЛЫМЯ“ [illegible] хроніка культурнага жыцьця СССР і заходня-эўрапэйскіх краін.

Гадавыя падпішчыкі на „ПОЛЫМЯ“ на 1928 г. атрымоўваюць па выбары бясплатна літаратурны дадатак АБО КАМПЛЕКТ „ПОЛЫМЯ“ або „МАЛАДНЯК“ за 1926 г. ці 1927 г., альбо замест камплекту „ПОЛЫМЯ“ ці „МАЛАДНЯКА“ ПЯЦЬ КНІЖАК на беларускай мове:

ЕМ. ЯРАСЛАЎСКАГА [illegible] А. КАГАН „Нацыянальны вызваленчы рух на Усходзе“ [illegible] „Заходняя Беларусь“ і „Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскім сойме“.

Паўгадавыя падпішчыкі атрымоўваюць у дадатак НАСЦЕННЫ КАЛЯНДАР на 1928 год і ДЗЬВЕ з памянёных вышэй кніжак.

Акрамя таго ГАДАВЫМ падпішчыкам прадстаўляецца расрочка 1 студзеня — 4 р. 50 к.; 1 [illegible] — 3 р. [illegible] к.; 1 [illegible] 2 руб. ПАЎГАДАВЫМ: 1 студзеня — 3 руб.; 1 ліпеня — 2 руб.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на год 10 руб., на 6 м-цаў 5 руб., на 3 м-цы 2 руб. 50 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у рэдакцыі часопісі „ПОЛЫМЯ“ (Менск, Савецкая, 63); у Цэнтральнай кнігарні Белар. Дзяржаўнага Выдавецтва [illegible] ва ўсіх акруговых аддзяленьнях Бел. Дзярж. Выдавецтва, ва ўсіх паштовых аддзяленьнях і ў канторы падпіскі на газэты „Праўда“ і „[illegible]“ (Менск, Савецкая 61), у канторы газэты „Беларуская Вёска“ (Менск, Савецкая [illegible]) і ўпаўнаважанымі і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР.

ЦАНА 25 КАП.

A000000 1965727